Ноч у крэпасці

Жалобныя мерапрыемствы і маштабная рэканструкцыя падзей першых дзён вайны прайшлі ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой».

Каля крэпасці людзі пачалі збірацца а трэцяй гадзіне ночы. Па сімвалічнай дарозе памяці прайшлі дзясяткі маладых людзей з запаленымі лампадкамі. На экранах трансліравалася ваенная хроніка, іграла музыка 40-х гадоў. А палове чацвёртай пачалася лазерная пастаноўка, цішыню ўзарвалі залпы артылерыйскага агню. У гэты час на плошчы Цырыманіялаў ужо сабраліся тысячы людзей. «Па добрай традыцыі мы сустракаемся на світанні 22 чэрвеня, каб выказаць сваю пашану тым, хто праявіў мужнасць і гераізм у першыя гадзіны вайны», — сказаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.**

На мерапрыемства ў крэпасці сабраліся не толькі брастаўчане. Паўтара дзясятка ўдзельнікаў афіцыйных дэлегацый з розных краін, шматлікія госці горада, турысты прыйшлі, каб аддаць даніну памяці абаронцам крэпасці. Усіх прысутных прывітаў **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.**

Пасля мітынгу адбыўся ўрачысты марш войскаў Брэсцкага гарнізона, а ў пяць раніцы на Кобрынскім умацаванні пачалася маштабная рэканструкцыя падзей першых дзён вайны. Гледачы ўбачылі атаку Самвела Мацевасяна, абарону 9-й пагранзаставы пад камандаваннем Андрэя Кіжаватава, фрагменты баёў, здачу ў палон дзяцей і жонак каманднага складу. Легендарны маёр Гаўрылаў, як вядома, прыняў апошні бой на 32-і дзень вайны. Удзельнікі пастаноўкі паказалі момант захопу ў палон цяжка параненага Гаўрылава. Дарэчы, ваенныя рэканструктары з Татарстана напярэдадні перадалі ў Музей абароны Брэсцкай крэпасці зямлю з малой радзімы Героя Савецкага Саюза Пятра Гаўрылава, які згодна з яго апошняй воляй, пахаваны ў Брэсце.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ Падрабязнасці

ШТО РОБЯЦЬ НА ВАЙСКОВЫХ МОГІЛКАХ?

У Мінску прыступілі да добраўпарадкавання Вайсковых могілак. Якія работы і навошта праводзяць на адным з найстарэйшых некропаляў сталіцы, расказалі спецыялісты.

Па словах **галоўнага архітэктара праектаў УП «Мінскпраект» Мікалая ДЗЯТКО,** рыхтуюцца матэрыялы па рэканструкцыі могілак, яны будуць накіраваныя ў камітэт архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама, Міністэрства культуры, у спецкамбінат КБА, УКБ Савецкага раёна, якое выступіць заказчыкам па праекце.

«Мяркуецца частковая мемарыялізацыя ўсяго комплексу, замена агароджы і ўваходных варот. Каваныя рашоткі, уваходная група будуць мець дэкаратыўныя элементы (скульптуры, барэльефы) ваеннай тэматыкі. Таксама гаворка ідзе пра ўладкаванне дадатковых пешаходных дарожак», — цытуе БелТА Мікалая Дзятко.

На могілках знаходзяцца пахаванні як перыяду Руска-турэцкай вайны XIX стагоддзя, так і часоў Першай сусветнай, Вялікай Айчыннай войнаў. Тут знайшлі супакой многія дзеячы навукі, літаратуры, мастацтва, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы краіны, у тым ліку класікі беларускай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас.

«Усе гэтыя перыяды знайшлі адлюстраванне ў канцэпцыі рэканструкцыі могілак. Разлічваем устанавіць малыя архітэктурныя формы з тлумачэннямі па розных групах пахаванняў. Дадаткова з'явяцца праходы да магіл з боку вуліцы Міхайлава, мяркуецца пашырэнне існуючай дарожкі ад вуліцы Казлова да храма Аляксандра Неўскага, замена брукаванкі на гранітныя пліты, установка лавак, новых ліхтароў. Таксама прадугледжана арганізацыя падсвятлення храма, помнікаў салдату, Якубу Коласу і Янку Купалу, арганізацыя дадатковага ўвахода з боку вуліцы Чырваназорнай», — расцлумачыў Мікалай Дзятко.

Вялікая ўвага ўдзелена вызваленню тэрыторыі ад насаджэнняў, якія ўяўляюць небяспеку, уздоўж дарожак будуць высаджаны кусты і кветкі. «Пакуль мы вызначылі толькі вобразнае рашэнне. Патрабуецца ўзгадненне перадпраектных прапаноў з зацікаўленымі ведамствамі, перш за ўсё з Міністэрствам культуры», — сказаў Мікалай Дзятко.

У цяперашні час прынята рашэнне аб добраўпарадкаванні тэрыторыі. **Прадстаўнік храма Аляксандра Неўскага протаіерэй Дзімітрый ХАРОШКА** адзначыў, што да гэтага каля трох гадоў вялася падрыхтоўчая работа. На магілах была размешчана інфармацыя з просьбай да сваякоў прывесці ў парадак пахаванні. «Могілкі, без усякага сумнення, з'яўляюцца часткай гісторыі горада. Мы ўдзячныя дзяржаве, Мінгарвыканкаму, што звернута ўвага на гэтыя пахаванні. У свой час яшчэ сын Якуба Коласа Даніла звяртаў увагу на недагледжанасць могілак, на адсутнасць агароджы. Яшчэ тады біў трывогу, каб гэткае ўнікальнае месца захаваць для будучых пакаленняў», — адзначыў ён.

Пры гэтым Дзмітрый Харошка дадаў, што па пытаннях выканання работ ідзе пастаянны дыялог з работнікамі спецкамбіната, на абслугоўванні якога знаходзяцца пахаванні. «Работы вядуцца ў адпаведнасці з дазволам Міністэрства культуры. Да 60-годдзя Вялікай Перамогі некаторая частка Ваенных могілак ужо рэканструявана і рэстаўравана. Важна, каб мы памяталі мінулае. Унікальныя надмагільныя збудаванні, вядома, будуць захаваны. Некаторыя занепакоены, што зразаюцца агароджы. На жаль, яны ў большасці выпадкаў аварыйныя і ўяўляюць пагрозу для людзей», — падкрэсліў Дзімітрый Харошка.

Як адзначыў **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце спецкамбіната КБА Сяргей ТУР,** добраўпарадкаванне заключаецца ў дэмантажы старых надмагільных збудаванняў, старых агароджаў, крыжоў. Тры гады таму спецкамбінат КБА праводзіў інвентарызацыю, каб удакладніць пахаванні, за якімі няма каму даглядаць. На іх месцы ўсталююць знакі-падгалоўнікі адзінага ўзору. Калі на старым надмагіллі былі прозвішча, імя і імя па бацьку, яны будуць выгравіраваны на ідэнтыфікацыйным знаку.

«Па новым законе аб пахаванні і пахавальнай справе, які ўступіў у сілу з ліпеня 2015 года, спецыялізаваная арганізацыя пры неабходнасці, але не радзей за адзін раз на два гады, камісійна праводзіць інвентарызацыю месцаў пахавання, якія знаходзяцца на абслугоўванні. На Вайсковых могілках з амаль 8 тысяч пахаванняў 3 тысячы 882 аказаліся закінутымі. Мы ў першую чаргу звярталі ўвагу на надмагіллі, ступень разбурэння якіх выключае рамонт або аднаўленне», — расцлумачыў Сяргей Тур.

Супрацоўнікі камбіната, калі знаходзілі кантакты, папярэджвалі сваякоў па тэлефоне або па пошце аб неабходнасці прывесці ў парадак магілы.

«Праз два гады пасля пачатку інвентарызацыі, як запісана ў законе, спецарганізацыя мае права ўтылізаваць і дэмантаваць надмагільныя збудаванні, добраўпарадкаваць месца пахавання. За гэты час мы ўзгаднілі праект ідэнтыфікацыйнага знака, які павінен усталёўвацца на месца пахавання. Ён узгоднены з міністэрствамі культуры, архітэктуры і будаўніцтва , Мінгарвыканкамам. Сёлета прынята рашэнне аб добраўпарадкаванні тэрыторыі, яе пачалі з 4 чэрвеня», — сказаў ён.

Работа будзе праводзіцца да канца года. Таксама камісія, у склад якой уключаны прадстаўнікі адміністрацыі Савецкага раёна, Мінгарвыканкама, праверыла стан зялёных насаджэнняў. Дрэвы, якія знаходзяцца ў аварыйным стане, выдаленыя ■

НЕ ДАВЯРАЙЦЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадукцыю, вырашчаную на ўчастку, абавязкова правяраюць на нітраты. Пры нас якраз вывучалі партыю агуркоў. Спачатку іх здрабняюць у блэндары: гэта неабходна, каб атрымаць больш дакладныя паказанні. З атрыманай «салаты» робяць адначасова дзве пробы. У празрыстыя шкляначкі накладаюць па 10 грамаў надзёртых агуркоў і заліваюць спецыяльным растворам. Потым у сумесь закідваюць магніт і ставяць ёмістасць на мяшалку на тры хвіліны. Пасля мераюць колькасць нітратаў. Прыбор паказвае 158 і 152 мг/кг. Гэта ў межах нормы: для агуркоў, вырашчаных у абароненым грунце, дапушчальным максімумам лічыцца 400 мг/кг. У бульбе нітратаў павінна быць не больш за 200 мг/кг, у цяплічных памідорах — да 300, у салаце, пятрушцы, сельдэрэі — да 2000. Больш за ўсіх солі азотнай кіслаты назапашвае салата латук.

Агуркі, узятыя на пробу, здрабняюць у блэндары.

— Мы працуем на праверанным абсталяванні. Што датычыцца дамашніх прыбораў, яны недакладныя і ў нашай рабоце не дапускаюцца, — заўважае Кацярына Дубікоўская на маё пытанне пра кампактныя нітратамеры, якія можна знайсці ў крамах.

За два дні зафіксавалі сем выпадкаў перавышэння колькасці нітратаў. Усе яны былі звязаны з кабачкамі.

— Шмат нітратаў часцей сустракаецца ў ранняй агародніне — бульбе, капусце, агурках, зеляніне, — засцерагае кіраўнік лабараторыі, але дадае, што цяперашнюю бульбу ўжо можна спакойна набываць. — Прадукцыя зусім без нітратаў да нас яшчэ не трапляла. Усё роўна ж падкормкі ўносяцца. Да таго ж солі азотнай кіслаты змяшчаюцца ў глебе. Таму хоць мінімум, але ў агародніне ён будзе. Абсалютна чыстыя агуркі можна атрымаць хіба што ў тым выпадку, калі вырасціць іх у прабірцы.

Калі грыбы «фаняць»

Усе дары лесу, якія прыносяць на рынак, правяраюць на радыёнукліды, а менавіта на цэзій-137. Як бы зборшчыку ні было шкада сваёй працы, але паўлітра ягад і грыбоў давядзецца аддаць у лабараторыю. Пасля даследавання гэтыя паўлітра не вяртаюць: па-першае, проба апрамяняецца, па-другое, прымятая прадукцыя ўсё роўна страчвае таварны выгляд.

Прадаўцы, якія нясуць ягады на пробу, кажуць, што пакуль у лясах ураджай небагаты. «Засуха, — уздыхае жанчына са Смаргонскага раёна. — У нас з пачатку лета не было нармальных дажджоў. Паглядзіце, якія чарніцы дробныя. А вось у Мінскай вобласці дажджы прайшлі і ягады куды лепшыя. Параўнайце (ківае на суседнія вёдры з чарніцамі, якія прывезлі з-пад Старых Дарог). Там суніцы збіраюць — памерам з мой пазногаць!»

Агародніна абавязкова правяраецца на нітраты.

Мужчына з Маладзечанскага раёна прыехаў на рынак з лісічкамі і ягадамі. Пяцілітровік чарніц ён збірае за дзве гадзіны. Прызнаецца, што пары дажджлівых дзён было мала для добрага ўраджаю: некаторыя паляны ў лесе ўжо павыгаралі ад сонца.

Праверка ў лабараторыі займае 10—20 хвілін. Сёння ўсе дары лесу атрымалі дабро.

— Глядзіце, ягады зусім чыстыя — 5,9 бэкерэля на кілаграм (дапушчальны ўзровень — 185 Бк/кг. — **Аўт.**), — звяртае ўвагу на паказанні радыёметра **ветурач Юлія АБРАМЧУК.**

Зборшчыкі грыбоў і ягад самі прыносяць тавар на экспертызу.

Чарніцы, загружаныя ў радыёметр.

Яна згадвае, што з пачатку сезона было толькі два перавышэнні па цэзіі — у лісічках. З грыбамі ўвогуле трэба быць асцярожнымі. У лабараторыі помняць, як аднойчы на продаж прынеслі грыбы, у якіх колькасць радыёнуклідаў дасягала амаль 9000 Бк/кг (пры норме ў 370)!

Калі агародніну, «начыненую» нітратамі, проста не дазваляюць прадаваць на рынку (адміністрацыя адсочвае, каб такі гандляр не стаў за прылавак), то партыю лясных ягад і грыбоў з завышаным цэзіем канфіскуюць і ўтылізуюць.

— Людзі на гэта рэагуюць па-рознаму, — не хавае Кацярына Дубікоўская. — Неяк у мужчыны канфіскавалі вельмі шмат чарніц, кілаграмаў 200, і ён дзякаваў, што мы не дапусцілі забруджаную ягаду да продажу. А бывае, даводзіцца абараняцца, міліцыю выклікаць. Незадаволеныя ў асноўным перакупшчыкі: яны ж ужо заплацілі за прадукцыю, узятую ў насельніцтва.

А вось назваць раён, адкуль часцей прывозяць забруджаныя грыбы і ягады, складана. Справа ў тым, што інфармацыя пра месца збору запісваецца са слоў прадаўцоў. Могуць сказаць, што «палявалі» ў Мінскім раёне, а ў суніцах шмат радыяцыі, што для прысталічча не характэрна.

Для прадаўцоў праверкі прадукцыі платныя. Кошт залежыць ад вагі. Напрыклад, за аналіз на радыёнукліды партыі да пяці кілаграмаў трэба заплаціць 2,80 рубля, а проба на нітраты партыі да 50 кілаграмаў абыдзецца ў 7,60 рубля. Калі ўсё ў парадку, на рукі выдаюць талон з «адзнакай якасці».

А вось імпартныя фрукты і ягады ў лабараторыі не правяраюць. Замежная прадукцыя паступае на Камароўку ўжо з дакументамі, таму яе дадатковую экспертызу на рынку праводзяць выбарачна.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Замерка нітратаў.

❍ У тэму

Дзяржаўны санітарны нагляд за рынкамі здзяйсняецца рэгулярна. Па яго выніках можна вылучыць наступныя недахопы: няправільныя ўмовы захоўвання прадукцыі — 35 % ад усіх парушэнняў, рэалізацыя харчовай сыравіны без дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку, — 17 %, продаж прадуктаў з няпоўнай маркіроўкай ці без яе — 12 %, рэалізацыя прадуктаў са скончаным тэрмінам прыдатнасці — 8 %, адсутнасць умоў для выканання правіл асабістай гігіены — 7 %.

Найбольш праблемным пытаннем з'яўляецца несвоечасовае правядзенне работ па паляпшэнні санітарна-гігіенічнага стану аб'ектаў — замена зношанага інвентару, халадзільнага абсталявання.

Загадчык аддзялення гігіены харчавання Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вія ШУКЕВІЧ паведаміла, што пад наглядам знаходзіцца 261 рынак па краіне. Вылучыць самы лепшы ці самы горшы немагчыма. Але станоўчая дынаміка ў развіцці аб'ектаў ёсць. Праводзяцца рамонты, змяняецца гандлёвае абсталяванне на больш сучаснае.

БРАЗІЛІЯ ЎСПОМНІЛА, ЯК ЗАБІВАЦЬ

У Групе Е ўчора зборная Бразіліі сустракалася з камандай Коста-Рыкі і толькі ў дадатковы час змагла здабыць перамогу. Бразільцы не паказвалі характэрнай для сябе гульні, а іх зорка Неймар, хоць і змяніў «локшынную» прычоску, не быў асабліва заўважны на полі, хіба толькі сімуляцыяй у штрафной саперніка, якую суддзя выкрыў з дапамогай відэапаўтору і адмяніў раней прызначаны пенальці. Каманда Коста-Рыкі практычна акапалася каля сваёй штрафной, ну а зборнай Бразіліі відавочна не хапала хуткасці, ды і з крэатывам у атаках былі праблемы. Да жалю костарыканцаў, яны не дацярпелі да нулявой нічыёй зусім крыху — на 91-й хвіліне Філіпэ Каўціньё ўсё ж прабіў Наваса, а ўжо на 97-й нарэшце вызначыўся і сам Неймар.

Ну, а каманда Аргенціны пасля паражэння з лікам 0:3 ад Харватыі перажывае цяжкія часы. Асабліва дасталася галоўнаму трэнеру Хорхе Сампаолі. Разюшаныя заўзятары пасля матча ганьбілі яго, не выбіраючы слоў, і нават плявалі ў яго бок і кідалі бутэлькі. Далей — горш, футбалісты зборнай дружна папрасілі прызначыць новага трэнера на матч супраць каманды Нігерыі. Як бачым, у аргенцінскім каралеўстве поўны разлад, а чэмпіён свету 1978 года ў складзе Аргенціны Марыа Кемпес заявіў, што «зборная Аргенціны не з'яўляецца цяпер камандай. Я бачу шмат «сяброў Месі» і не бачу «партнёраў Месі».

Іван КУПАРВАС.

■ Здарэнне

НА «ФАНДАКУ» АДБЫЎСЯ ВЫБУХ

Такое паведамленне паступіла ў МНС каля сямі гадзін увечары 21 чэрвеня. Ратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, убачылі, што з будынка завода драўнянастружкавых пліт валіць дым, таксама часткова разбураны сэндвіч-панэлі і выбіта шкло.

— Калі адбылося здарэнне, то ў цэху знаходзіліся 22 рабочыя, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Апёкі атрымаў аператар участка сушкі і сарціроўкі. Ён шпіталізаваны. Яшчэ дзвюм работніцам асколкі нязначна падрапалі скуру. Пажар быў аператыўна ліквідаваны. Прычына выбуху высвятляецца, але ў якасці адной з версій разглядаецца парушэнне тэхнічнага рэгламенту.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

АСЦЯРОЖНА: ПАДРОБКА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)


Вольга МАЛАШЭНКА дэманструе тыя самыя лыжкі з партрэтамі цароў.

— Той жа пярсцёнак «Мёртвая галава», персанальны ўзнагародны знак, які выдаваўся асабіста Генрыхам Гімлерам, членам СС, — прыводзіць прыклад Аляксей Бацюкоў. — Прадаўцы з інтэрнэту выдаюць яго за арыгінал, хоць гэта дастаткова рэдкі знак. Але падробкамі запалонены ўвесь рынак.

Музейныя работнікі могуць па выглядзе даць ацэнку тым ці іншым прадметам даўніны. Суразмоўнік узгадвае, што прыходзілася ідэнтыфікаваць кнігі, зброю, некаторыя побытавыя рэчы. Але перад тым як набыць чарговы экспанат, музей кансультуецца з больш дасведчанымі спецыялістамі. Напрыклад, калі размова ідзе пра тыя ж кнігі — гэта Нацыянальны гістарычны архіў або аддзел рэдкіх кніг Нацыянальнай бібліятэкі. Кансультацыю па карцінах можна атрымаць у Нацыянальным мастацкім музеі.

— Калі мы набывалі ў сваю калекцыю літургічнае пакрывала з фрагментамі слуцкіх паясоў, мы кансультаваліся са спецыялістамі гэтага музея, — удакладняе Аляксей Бацюкоў. — І яны пацвердзілі, што гэта арыгінал.

Нярэдка ўладальнікі так званых рарытэтных рэчаў перабольшваюць значэнне сваіх скарбаў. Нядаўна ў музей звярнуўся мужчына, які сцвярджаў, што яго цясак, нешта накшталт невялічкай шаблі, адносіцца да часоў Паўночнай вайны — пачатку XVIII стагоддзя. Але ў музеі пільна агледзелі рэч і засумняваліся, што яна настолькі старадаўняя. У выніку высветлілася, што цясак сапраўды не падробка, але перыяду не Паўночнай вайны, а вайны з Напалеонам — 1812 года.

НЕ ЎСЁ ТОЕ ЗОЛАТА, ШТО БЛІШЧЫЦЬ

У магілёўскіх музеях асабліва падазрона ставяцца да тых прадметаў, якія іх уладальнікі выдаюць за рарытэты. **Галоўны захавальнік фондаў Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея Вольга МАЛАШЭНКА** згадала два «свежыя» выпадкі, калі прапаноўваліся відавочныя падробкі.

— Гэта былі дзве манеты Расійскай Імперыі і сярэбраная лыжка з царскіх рублёў, — расказвае яна. — Адна з манет вартасцю тры рублі 1840 года выпуску лічыцца рарытэтам. У каталозе напісана, што яна была выпушчана ў адным (!) экзэмпляры. Мы праверылі дыяметр і вагу манеты, якую нам прынеслі, і яны прыкметна адрозніваліся ад арыгінальных параметраў. Пры неабходных 10,36 грама падробка важыла ўсяго 6,38 грама. Наогул плацінавыя манеты Расійскай Імперыі рэгулярна выстаўляюцца на нумізматычных аўкцыёнах, але павінна насцярожваць тое, што гэта дастаткова рэдкія рэчы. Асабліва тыя, што былі адчаканены ў 1839—1840 гадах. Іх рабілі ўсяго па адной-дзве адзінкі.

Рубель 1911 года быў у Расійскай Імперыі больш распаўсюджанай манетай. Але грашовая адзінка, якую прынеслі на экспертызу знаўцам, пры адносна роўных вазе і дыяметры аказалася таўсцейшая. Таўшчыня рубля, як указана ў каталозе, павінна быць 1,2 міліметра, а ў гэтага яна дасягала двух міліметраў.

— Тыраж манеты быў дастаткова вялікі, і для недасведчаных людзей яна магла падацца арыгіналам, — канстатуе Вольга Малашэнка. — Падробка такая ж жоўтая, як і павінна быць, практычна такога ж дыяметра, вагі. Але, калі ўлічваць усе нюансы, амаль у два разы аказалася таўсцейшая.

Спецыяліст раіць: калі вы нешта шукаеце для сваёй калекцыі, трэба ўважліва азнаёміцца з прадметам. Калі размова ідзе пра нумізматыку, трэба спачатку вывучыць даныя каталогаў. Іх можна знайсці ў інтэрнэце без праблем. На тым жа блышыным рынку трэба быць асабліва ўважлівым. Калі сумняваецеся, лепш адмовіцца ад пакупкі. Тады не прыйдзецца кагосьці вінаваціць у тым, што купілі фальшыўку. Як той казаў, вочы бачылі, што рукі бралі.

Пра лыжкі-фальшыўкі з партрэтамі цароў таксама шмат чаго напісана ў інтэрнэце. Тым не менш знаходзяцца ахвотныя прапанаваць іх.

— Такія лыжкі сапраўды рабіліся з юбілейных рублёў у XVIII—XIX стагоддзях і выпускаліся да пэўных дат абмежаванай колькасцю, — расказвае галоўны захавальнік. — Але тыя, што запаланілі рынак сёння — відавочная падробка. Хоць выглядаюць яны вельмі пераканаўча, з пацінай, слядамі старэння, нават з клеймамі таго часу.

БІЗНЕС НА ПАДРОБКАХ

Памятаеце анекдот: «А гарантыя ёсць, што гэта Рэмбрант не падроблены? — Так, ёсць. Тры гады»? Насамрэч гарантаваць стапрацэнтную сапраўднасць нейкіх прадметаў мастацтва вам ніхто не зможа. Асабліва там, дзе працуюць майстры сваёй справы.

— Сёння вельмі шмат прапануецца савецкага фарфору 50—60-х гадоў, — прыводзіць прыклад Вольга Малашэнка. — Існуе шмат гжэлеўскіх падробак, нягледзячы на тое, што завод і зараз працуе. І аматарам фарфоравай скульптуры трэба ведаць, як прадметы іх інтарэсу выглядаюць у каталогах. Шмат існуе копій нямецкага фарфору, напрыклад пачатку XX стагоддзя. Але гэта не заўсёды агаворваецца. І людзі плацяць вялікія грошы за, мякка кажучы, шырспажыў. Калі такія рэчы трапляюць да нас, мы праглядаем усе каталогі, антыкварныя сайты, параўноўваем цэны ў Беларусі, Расіі, Украіне, раімся з калекцыянерамі і толькі тады прыходзім да нейкага кансэнсусу.

БАБУЛІНА СПАДЧЫНА

Знайсці скульптуру і шмат чаго іншага савецкага перыяду можна і на Магілёўскім рынку, які ў народзе па-ранейшаму называецца Быхаўскім. Тут наогул прадаецца вялікая колькасць прадметаў быту 50—60-х гадоў. Гэта рэчы нядаўняй эпохі, і асаблівых ведаў, каб у іх разабрацца, не патрэбна. Магчыма, праз некалькі дзесяцігоддзяў нешта з гэтага і стане каштоўнасцю. Для музейшчыкаў зараз цікавасць уяўляюць іконы, прадметы мяккай этнаграфіі, некаторыя іншыя рэчы.

— Часам людзі прыносяць да нас іконы, каб проста нешта даведацца пра іх, — расказвае **загадчыца філіяла Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея — Музея этнаграфіі Святлана РЫБАКОВА.** — Абразы веткаўскай школы, напрыклад, з ніякімі іншымі нельга пераблытаць. Але, калі ўзнікаюць цяжкасці, раіліся з Нацыянальным мастацкім музеем. Некаторыя ўладальнікі бабуліных строяў або ручнікоў блытаюць час стварэння гэтых прадметаў. Упэўнены, напрыклад, што гэта канец XIX стагоддзя, а я бачу — пачатак XX стагоддзя і не раней. Цікавасць для нас уяўляюць таксама фотаздымкі, асабліва ў адзенні традыцыйным для таго ці іншага рэгіёна. Напрыклад, у 60-я гады ў Хоцімскім раёне яшчэ насілі адзенне з элементамі народнага касцюма. Вельмі цікавыя для нас упрыгажэнні 50—60-х гадоў, якія выкарыстоўвалі да народных касцюмаў. Гэта пацеркі, каралі, падвескі, галаўныя ўборы.

Фота пэўнага часу таксама даносіць да нас дух атмасферы. Але іх калекцыянерам трэба зноў жа быць уважлівымі, папярэджвае магілёўскі фотамайстар са шматгадовым стажам Ірына Савосіна.

— Складана бывае адрозніць рэпрадукцыю ад сапраўднай фатаграфіі, — кажа яна. — Напрыклад, вам прапануюць фота канца XIX стагоддзя. Зрабіць падробку пры сучасных тэхналогіях проста, як, дарэчы, і ў мастацтве. І тут павінен быць спецыяліст, які па хімічным аналізе вызначыць, да якой эпохі адносілася папера фотаздымка.

Сярод падробак часта можна сустрэць пярсцёнак «Мёртвая галава».

ПАРАДЫ АД СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Перад тым як пачаць калекцыяніраваць, трэба даведацца аб прадмеце свайго інтарэсу як можна болей. У гэтым вам дапамогуць як інтэрнэт, так і знаёмства з музейнымі экспанатамі.

На заметку тым, хто калекцыяніруе карціны. Ёсць толькі тры надзейныя месцы, дзе іх можна набыць: карцінная галерэя, непасрэдна майстэрня мастака, а карціны болей ранняга перыяду знаўцы раяць купляць у аўтарытэтнай антыкварнай краме.

Калекцыяніруйце, на здароўе. Гэта пашырае кругагляд, кола знаёмых, загартоўвае нервы. Галоўнае, каб жаданне завалодаць пэўным прадметам не выходзіла за межы дазволенага. Як і спроба зарабіць на няведанні іншых.

Часам на дакументальным фота, якое рабіліся на бромасярэбранай паперы, нядобрасумленны аўтар мог дабавіць (удрукаваць) яшчэ нейкі іншы прадмет або нават чалавека, іншымі словамі сказіць факт або падзею. Пры блізкім разглядзе здымка пабочны прадмет можна выявіць па святлацені. Але былі і такія падробкі, дзе праўду мог рассакрэціць толькі крыміналіст.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

У фондах Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея захоўваецца больш за 290 тысяч прадметаў. Але музейныя плошчы дазваляюць нам убачыць толькі працэнты чатыры. Пазнаёміцца з музейнымі рэдкасцямі можна на выстаўках аднаго дня або падчас Ночы музеяў. Так што сачыце за афішай.

Нэлі ЗІГУЛЯ.